УДК 27»11/12»+241.74

# МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ СРОДКІ ПАДТРЫМКІ КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў XII–XIII стст.

**Клімуць Лада Яраслаўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (г. Магілёў, Беларусь)

*Материальная поддержка церкви была как принудительной, так и добровольной, хотя четко разделить эти понятия затруднительно. В пожертвованиях на церковь людьми двигало не только желание спасти душу. Наблюдается намерение контролировать церковные дела, а городской собор воспринимается как символ гражданской гордости.*[1]

Выкананне паўсядзённай царкоўнай службы, утрыманне і адукацыя святароў, а таксама будаўніцтва, утрыманне і рамонт сабораў патрабавалі рэгулярных сум. Царква пастаянна залежала ад падтрымкі грамадства, без якой не магла б выконваць свае функцыі. Таму былі выпрацаваны правілы абавязковых і добраахвотных падараванняў, з-за чаго фарміравалася складаная сетка сувязей паміж насельніцтвам і інстытутамі царквы.

Многія рысы падтрымкі сярэднявечнай царквы сталі вынікам развіцця на працягу стагоддзяў. Іх трансфармацыя праяўляецца ў юрыдычным афармленні ранейшых практык дзякуючы развіццю кананічнага права, а таксама ў выніку новых тэндэнцый у якасці і колькасці данацый пад уплывам сацыяльных і культурных змен.

Матэрыяльную падтрымку царкве звычайна падзяляюць на прымусовую і добраахвотную. Аднак не ўсё так проста, як паказвае нам дзесяціна. Добраахвотная ў адпаведнасці са Старым Запаветам, дзесяціна ў асноўным выплочвалася з сельскагаспадарчай прадукцыі, але не мінала любыя тыпы самых маленькіх даходаў. Як гэта бывае з падаткамі, ад яе спрабавалі ўхіліцца ці не выплочваць поўнасцю. На гэту праблему звярнуў увагу Чацвёрты латэранскі сабор 1215 г., які ў Каноне 53 асудзіў перадачу апрацоўкі зямлі не хрысціянам з мэтай пазбег-

[1] Результаты исследования получены при выполнении задания 12.1.2 ГПНИ «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства».



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нуць выплаты дзесяціны [3, с. 259]. Аднак неабходна адзначыць, што, нягледзячы на імкненне прыхаджан знізіць дзесяціну, не назіралася апазіцыі самой гэтай сістэме [2].

Змена практык аплаты за пахаванне таксама ілюструе тое, як многія спрабавалі пазбавіцца ад выплаты дзесяціны. І не толькі прыхаджане адмаўляліся плаціць. Ужо на Трэцім Латэранскім саборы 1179 г. было пастаноўлена, што нельга адчужаць дзесяціну недухоўным асобам без згоды папы [3, с. 219].

Яшчэ адноў крыніцай даходаў для царкоўных прыходаў была плата за асноўныя царкоўныя паслугі (вянчанне, хрышчэнне, пахаванне), за правядзенне вялікіх святаў. Аднак Чацвёрты Латэранскі сабор пастанавіў, што ўсе сакрамэнты павінны быць бясплатнымі, хоць на практыцы за іх плацілі. Значыць, гэтыя выплаты нельга называць абавязковымі. Але яны былі вельмі істотнымі для самога існавання святароў і царквы. І царкоўныя статуты на месцах уводзілі ў правіла плаціць за паслугі царквы, хоць гэта супярэчыла тэарэтычным выкладкам Латэранскага сабора.

У XIII ст. папа імкнуўся кантраляваць не толькі падаткі прыхажан, але і царкоўныя расходы. К гэтаму часу з дзесяціны перасталі выдзяляць епіскапскую долю, але епіскапы атрымалі іншыя правы забіраць грошы з прыходаў, такія як пракурацыі – права на размяшчэнне для сябе і свайго атачэння падчас візітацый [4, с. 120]. Царкоўныя прыходы павінны былі падпарадкоўвацца правілам у распараджэнні сродкамі ад дзесяціны. І прыхажане не проста аддавалі дзесяціну; яны таксама неслі адказнасць за пэўныя элементы структуры прыходскай царквы [5, с. 217].

Можна пералічыць розныя падарункі і выплаты, якія добраахвотна ахвяравалі царкве. Данатары не проста спадзяваліся на духоўнае ўзнагароджанне, абяцанае царквой. Гэта было імкненне стаць часткай абшчыннай ідэнтычнасці і павялічыць свой сацыяльны статус. Для таго каб пашырыць магчымасці атрымання даходаў, уводзілі дадатковыя святы ці прадстаўлялі новыя рэліквіі. Прыклад такога новага свята – Свята Цела і Крыві Хрыстовай, якое прыносіла значны даход. Пажаданым было і прыцягенне пілігрымаў. Каб іх прывабіць, нават падроблівалі рэліквіі. Індульгенцыі абяцалі скарачэнне колькасці дзён у чысцы ўзамен на наведванне службы ў вызначаных цэрквах. Пра ўсе новаўвядзенні аб'яўлялі публічна.

Усе гэтыя падараванні царкоўным інстытутам былі звязаныя з тагачаснай канцэпцыяй жыцця пасля смерці. Ж. Ле Гофф назваў XIII ст. стагоддзем чысца [1]. Вера ў чысцец вызначала мадэлі падараванняў царкоўным інстытутам. У Раннім Сярэднявеччы большую частку ахвяраванняў атрымоўвалі манастыры. К XIII ст. прыходскія цэрквы і святыні сталі галоўнымі атрымальнікамі такіх ахвяраванняў.

Такія трансфармацыі былі непасрэдным вынікам эканамічных змен у Еўропе таго часу. Змены адбываліся ўжо на працягу аднаго пакалення, як гэта было ў Вене. Любімай установай сям'і Гоген Марктаў было цыстэрцыянскае абацтва Хайлігенкройц. Наступнае пакаленне ахвяравала грошы гарадскому шпіталю.

Новай тэндэнцыяй быў пераход увагі ад сельскіх да гарадскіх і ад манаскіх да грамадзянскіх інстытутаў. У Познім Сярэднявеччы багатыя гараджане пачынаюць засноўваць прыватныя капліцы. Тое, што розныя ўстановы маглі забяспечваць тыя паслугі, якія раней можна было атрымаць толькі ў прыходскіх цэрк-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вах, гаворыць аб жаданні больш кантраляваць царкоўныя інстытуты, якім было даверана клапацціца пра душы людзей.

Ахвяраванні рэлігійным установам у XIII ст. мяняюцца не толькі якасна, але і колькасна. У каралеўскай адміністрацыі Англіі ўзнікла трывога наконт колькасці зямлі ў руках рэлігійных устаноў. І так было і ў іншых краінах, як сведчаць дакументы. Людзі больш імкнуліся ўдзельнічаць у жыцці царквы з пачаткам грэгарыянскіх рэформ; гэты працэс набіраў сілу ў XII – XIII стст.

Таксама ў XIII ст. з'яўляецца ўсё больш тэстаментаў. Падараванні царкве ў іх можна лічыць добраахвотнымі падараваннямі. Сведкі маглі націснуць на чалавека, каб ён не забыўся нешта аддаць царкве. У Англіі ў XIV ст. у тэстаментах звычайна пазначаны плацяжы за пахаванне [5, с. 216].

Значным зменам у XIII ст. падвяргаецца яшчэ адзін аспект матэрыяльнай падтрымкі – дабрачыннасць. Колькасць ахвяраванняў на дабрачыннасць у тэстаментах павялічваецца. Гэтыя змены звязаныя з развіццём эканамічных і сацыяльных умоў. Асабліва любілі ахвяраванні шпіталям, таму што тады мноства людзей малілася за душу памерлага. Акрамя таго, данатары ўжо пры жыцці бачылі, на што пойдуць іх грошы.

Аднак адзін толькі страх перад праклёнам душы не тлумачыць такую шчодрую падтрымку царкоўных устаноў. Асобныя данатары рабілі вялікі ўнёсак на тыя ж вітражы ці літургічныя прадметы. Трэба памятаць, што сабор быў сімвалам абшчыны і грамадзянскай годнасці. Напрыклад, калі будавалі новы сабор у Солсберы, не толькі кароль Генрых III, але і мясцовае насельніцтва дало значны ўнёсак. Але матэрыяльная падтрымка рэлігійных твораў мастацтва патрабуе асобнага даследавання.

## Літаратура


1. Ле Гофф, Ж. Рождение чистилища / Ж. Ле Гофф. – Екатеринбург: У-Фактория; М.: АСТ МОСКВА, 2009. – 544 с.

2. Constable, G. Resistance to Tithes in the Middle Ages / G. Constable // Journal of Ecclesiastical History. – Volume 13 Issue 2. – 1962. – P. 172 – 85.

3. Decrees of the Ecumenical Councils / ed.: N.P. Tanner. – Georgetown University Press, 2017. – 1324 p.

4. Moorman, J. R. H. Church Life in England in the Thirteenth Century / J. R. H. Moorman. – Cambridge University Press, 2010. – 486 p.

5. Swanson, R. N. Church and Society in Late Medieval England / Swanson, R. N. – Blackwell Pub, 1989. – 427 p.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова